Падтрымай "Вясну" на PATREON

Да трох гадоў "хіміі" асудзілі музыку Дзмітрыя Шыманскага за ўдзел у пратэсце 16 жніўня

29.10.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Дзмітрый Шыманскі ў судзе. Фота BY_culture

У судзе Заводскага раёна 29 кастрычніка вынеслі прысуд палітзняволенаму музыку Дзмітрыю Шыманскаму, якога вінавацілі ў арганізацыі і падрыхтоўцы дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, а таксама навучанні ці іншай падрыхтоўцы асобаў для ўдзелу ў такіх дзеяннях – ч. 1 і ч. 2 арт. 342 Крымінальнага кодэкса.

Справу разглядаў суддзя **Алег Каляда**.

Паводле абвінавачвання, **Дзмітрый Шыманскі** быў даставерна дасведчаны з розных крыніцаў аб планаваным правядзенні 16 жніўня 2020 года на тэрыторыі г. Мінска масавых мерапрыемстваў і не пазней за 18 гадзін 24 хвілін, дзейнічаючы групай асоб па папярэдняй змове з **Пятром Марчанкам**, **Юліяй Юніцкай (Марчанка)**, **Надзеяй Калач**, **Уладзімірам Калачом**, **Антонам Шніпам** і іншымі неўстаноўленымі асобамі, прыбыў на вуліцу Леніна, дзе з мэтай выказвання незаконнымі спосабамі сваіх грамадска-палітычных поглядаў і пратэсту, вядзення дэструктыўнай дзейнасці, накіраванай у тым ліку на абвостранне напружанасці ў грамадстве, прыняў актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, што груба парушаюць грамадскі парадак і спалучаных з відавочным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікам улады, далучыўся да групы грамадзян, якія ўдзельнічаюць у пратэсце: рухаўся ў натоўпе, публічна выкрыкваў лозунгі, перакрываў праезную частку і адмаўляўся яе пакінуць, гучна пляскаў рукамі, неаднаразова адмовіўся выканаць законныя патрабаванні супрацоўнікаў міліцыі, наўмысна перашкаджаў нармальнаму руху транспарту і працы прадпрыемстваў. Такім чынам, Шыманскі здзейсніў злачынства па ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса.

Ён жа загадзя дамовіўся з Марчанкам, Юніцкай, сужэнцамі Калач і Шніпам аб сумесным здзяйсненні злачынства, прадугледжаным ч. 2 арт. 342 КК, папярэдне ўзяўшы з сабой у якасці сродкаў здзяйснення злачынства музычныя інструменты, у тым ліку дуды, барабаны, гітары і іншыя, прыбыў на вул. Леніна г. Мінску з мэтай выказвання незаконнымі спосабамі сваіх грамадска-палітычных поглядаў і пратэсту, ажыццявіў іншую падрыхтоўку асоб для ўдзелу ў групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак, якая заключалася ў фарміраванні ў іншых асоб устойлівых псіхалагічных якасцяў, установак, якія прадвызначаюць іх суб'ектыўнае актыўнасць і жаданне ўдзельнічаць у супрацьпраўных дзеяннях 16 жніўня і ў іншыя дні, калі гэта спатрэбіцца: знаходзячыся сярод натоўпу асоб, гуляў сумесна з іншымі музыкамі на інструментах, выконваў музычную кампазіцыю, падобную з песняй «Перемен» групы «Кіно» на словы Віктара Цоя.

Дзмітрый Шыманскі сваю віну прызнаў часткова. Ён быў затрыманы 2 жніўня на святкаванні дня народзінаў Надзеі Калач з іншымі музыкамі і ўдзельнікамі фэнтэзі-фолк гурта IRDORATH, адразу быў асуджаны на **15 сутак арышту**.

У судзе Шыманскі патлумачыў, што яго прафесійная дзейнасць звязаная з музыкай – грае на духавых, струнных і ўдарных інструментах, арганізуе святы. Ён быў не згодны з тым, што адбывалася ў жніўні 2020 года – гвалт яго абураў, таму вырашыў прыняць удзел у масавым мерапрыемстве, папярэдне сазваньваўся з Уладзімірам Калачом, запытваўся, ці плануюць яны пайсці на масавае мерапрыемства. 16 жніўня абвінавачаны сустрэўся з сужэнцамі Калач, Марчанкамі і Шніпам, далучыліся да пратэстнага маршу, музыкі рухаліся ў натоўпе людзей па вуліцах горада. У нейкі момант Уладзімір і Надзея пачалі граць песню В. Цоя “Перамен”, тады Шыманскі падабраў ноты і таксама пачаў граць. Абвінавачаны падкрэсліў, што большую частку шляху ішоў па тратуары, а не па праезнай частцы дарогі, транспарт не хадзіў, бо машыны ДАІ перакрывалі дарогу. Не бачыў міліцыянераў, апроч ДАІшнікаў, і чуў патрабаванняў разыйсціся ад супрацоўнікаў міліцыі. Адзначыў, што не мог выкрыкваць лозунгі і пляскаць у далоні, бо граў на валынцы.

Падчас спрэчак бакоў пракурорка адзначыла, што дзеянні Шымановіча па ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса кваліфікаваныя правільна, а прад’яўленныя абвінавачванні па ч. 2 арт. 342 КК не знайшлі свайго пацверджання падчас судовага следства, у сувязі з чым дзяржабвінавачванне адмаўляецца ад абвінвачванняў у гэтай частцы. Таксама пракурорка прасіла выключыць з абвінавачванняў указанне на выкрыкванне лозунгаў Дзмітрыем і здзяйсення гучных пляскання у далоні, паколькі ўказаныя сведчанні не знайшлі свайго пацверджання. Прасіла суд прызнаць Дзмітрыя Шыманскага вінаватым і

прызначыць яму па ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса **пакаранне ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на тры гады**, а грамадзянскі пазоў ад “Мінсктранса” задаволіць.

Абаронца прасіў прызначыць пакаранне без накіравання ў папраўчую ўстанову, каб Дзмітрый мог працягваць займацца сваёй прафесійнай дзейнасцю. Наконт заяўленага пазову адвакат адзначыў, што раней суд ужо спагнаў сродкі на карысць “Мінсктранса” з іншых абвінавачых за падзеі 16 жніўня, а спаганяць з Шыманскага на тых жа самых падставах тыя ж самыя сродкі – супярэчыць нормам матэрыяльнага права, а разлік носіць прыблізны характар.

Аднак суддзя Алег Каляда падтрымаў пазіцыю дзяржаўнага абвінавачванні і прысудзіў Дзмітрыю Шыманскаму тры гады "хіміі".

Твитнуть









чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску




#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў

рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY